УДК 821.161.3.09
ББК 83.3(4Беи)
А 43

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна"*

*Рэдакцыйная калегія:*

кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Л. В. Леванцэвіч**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Т. А. Кіеель**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Н. Р. Якубук**

*Рэцэнзенты:*

загадчык кафедры беларускай і рускай моў УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Н. М. Борсук**

загадчык кафедры рускай літаратуры і журналістыкі УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна", кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Л. В. Скібіцкая**

А 43 **Актуальныя** праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Брэст, 20 лістап. 2019 г. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна ; рэдкал.: Л. В. Леванцэвіч, Т. А. Кісель, Н. Р. Якубук ; пад агул. рэд. Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : БрДУ, 2020. – 281 с.
ISBN 978-985-22-0119-3.

У зборнік уключаны матэрыялы, прысвечаныя актуальным праблемам гісторыі, тэорыі і методыкі філалагічных дысцыплін.

Адрасуецца спецыялістам-філолагам, студэнтам гуманітарных факультэтаў, магістрантам, аспірантам, настаўнікам.

**УДК 821.161.3.09**
**ББК 83.3(4БИ)**

**ISBN 978-985-22-0119-3**

© УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна", 2020

4. Дайнека, Л. Жалезныя жалуды. У. Арлоў [Электронны рэсурс] / Л. Дайнека. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Leanid_Dajnieka/Zaleznyja_zaludy.html. – Дата доступу: 15.12.2019.
5. Дамарад, І. І. Гістарычная проза Вольгі Іпатавай: Праблематыка і паэтыка : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / І. І. Дамарад. – Мінск, 2002. – 20 с.
6. Дарагакупец, А. М. Тэндэнцыі рамантызацыі і інтэлектуалізацыі ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе / А. М. Дарагакупец // Электронны каталог Нацыянальнай бібліятэкі. – 20 с.
7. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха. Чорны замак Альшанскі / У. Караткевіч. – Мінск : Звязда, 2000 – С. 130–205.
8. Наварыч, А. Літоўскі воўк [Электронны рэсурс] / А. Наварыч. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Ales_Navaryc/Litouski_vouk.html. – Дата доступу: 18.12.2019.
9. Шынкарэнка, В. К. Гістарычная проза Уладзіміра Караткевіча і традыцыі еўрапейскай літаратуры / В. Шынкарэнка // Літаратуразнаўства. Этналогія : матэрыялы IV міжнар. кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапейскіх краін", Мінск, 6–9 чэрв. 2005 г. / пад рэд. І. Багдановіч, Т. Валодзінай. – Мінск, 2010. – С. 187–192.

**І. А. Воран**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

## НЕАРАМАНТЫЧНАЯ ПРЫРОДА РАННЯГА БЕЛАРУСКАГА МАДЭРНІЗМУ

У сучасным літаратуразнаўстве навукоўцы ўсё больш актыўна карыстаюцца тэрмінам "неарамантызм" у вызначэнні спецыфікі беларускага мадэрнізму пачатку ХХ ст. (І. Багдановіч, Л. Дарошка, Т. Кабржыцкая, І. Крыштоп, Т. Мацюхіна і інш.). У сусветнай культуралагічнай традыцыі да неарамантыкаў адносяцца Р. Вагнер, Ф. Ніцшэ, Г. Ібсен, М. Метэрлінк, Г. Гауптман, Д. Лондан, Э. Растан, С. Пшыбышэўскі, С. Жэромскі, К. Тэтмаер, Я. Каспровіч, Р. Рыльке, Л. Андрэеў, М. Цвятаева і Л. Гумілёў і іншыя літаратары. Увагу звяртае мастацка-эстэтычная мазаічнасць прадстаўнікоў гэтай плыні ў розных літаратурах, яе неаднароднасць, недыферэнцыянаванасць, што таксама з'яўляецца яе канцэптуальнай асаблівасцю сярод іншых нерэалістычных плыняў таго часу.

У літаратуразнаўчым слоўніку неарамантызм вызначаецца як "стылявая хваля мадэрнізму, вызначальнымі рысамі якой у параўнанні з рамантызмам з яго канцэптуальным разрывам паміж ідэалам і рэчаіснасцю, выявілася канструктыўная спроба пераадолець супрацьстаянне гэтых канфліктных апазіцый" [2, с. 504]. Таму гэтую плынь вызначаюць і як "познюю мадыфікацыю рамантызму" (Д. Налівайка). Родавай прыкметай неарамантызму стала яго сінтэтычная прырода, якая выцякае з двух тыпаў

творчасці – рэалістычнага і рамантычнага – і ўзбагачаецца новымі тэндэнцыямі, характэрнымі для мадэрнізму. Сярод іншых яго прыкмет вылучаюцца драматызм, стыхійнасць, месіянізм, фантастыка, схільнасць да міфалагізацыі рэчаіснасці, пошук выключнага ў паўсядзённым, містыцызм і культ моцнай асобы.

Беларуская літаратура пачатку XX ст. не ўяўлялася нечым закрытым: у крытыцы вылучалася ідэя адкрытасці, неабходнасці ўлічваць мастацкія дасягненні сусветнай літаратуры, але ў сувязі з пачаткам станаўлення асобныя крытыкі і літаратары праяўлялі насцярожанасць да мадэрнізму. Насцярожанасць гэтая адлюстравалася вельмі выразна ў нашаніўскай палеміцы 1913 г. пра далейшыя шляхі развіцця літаратуры, у якой прынялі удзел В. Ластоўскі, Я. Купала, Л. Гмырак, М. Багдановіч, і завастралася, галоўным чынам, на праблеме пранікнення “шкодных” для адраджэнскай літаратуры дэкадэнцкіх матываў. Падобная рэакцыя некаторых паэтаў абумоўлена тым, што на гэтым этапе развіцця разам з актыўным узбагачэннем айчыннай традыцыі за кошт сусветных мастацкіх набыткаў уласная літаратура пачала выпрацоўваць своеасаблівы імунітэт, зыходзячы з сацыяльных, грамадскіх і эстэтычных яе патрэб. Е. Янкоўскі, вядомы польскі паэт-футурыст таго часу, заўважыў, што ў беларускай культуры пачатку XX ст. “ідзе барацьба, каб захаваць залаты дукат уласнай самабытнасці, калі ціснуць чужыя культуры, ідзе барацьба за самастойнае існаванне” [5, с. 125], што таксама прадвызначала спецыфіку літаратурнага развіцця: ідэалагічную заангажаванасць, пэўную эстэтычную герметычнасць і нават дэкларатыўнасць.

Нацыянальнае адраджэнне суправаджаецца агульнай атмасферай духоўнага аднаўлення, абуджэння, што супярэчыць агульнай песімістычнай атмасферы дэкадансу. Гэтая акалічнасць прадвызначыла амбівалентны характар яго (і мадэрнізму) рэцэпцыі ў беларускай крытыцы пачатку XX ст. З аднаго боку, беларускія крытыкі пры ацэнках дэкадансу (найперш, польскага і рускага варыянтаў) і перспектыў яго развіцця ва уласных літаратурах прытрымліваліся пераважна “адной лініі”: як светапоглядная сістэма ён непрымальны для маладых літаратур, якія знаходзяцца ў пошуку ідэйнай асновы нацыі. З іншага боку, беларускія літаратары, развіваючы сувязі, не маглі заставацца безуважнымі да заходніх мастацка-эстэтычных павеваў. Таму М. Багдановіч, паслядоўна не прымаючы дэкаданс як ідэалагічную сістэму, абсалютна натуральна успрымаў новую эстэтыку мадэрнізму, неабходную для інтэлектуальна-мастацкага ўдасканалення ўласнай літаратуры, таму ён увёў у беларускую літаратуру ідэю “чыстай красы”, на якую абапіраліся еўрапейскія дэкаданты. Як заўважае І. Багдановіч, “для яго «дэкадэнцкая» плынь была адной з тых літаратурных «майстэрняў» Еўропы, у якую трэба было

«зазірнуць» і беларускай літаратуры, каб не выбівацца з еўрапейскага агульнакультурнага кантэксту” [1, с. 259].

У беларускай крытыцы пачатку XX ст. тэрмін “мадэрнізм” (і тым болей “дэкаданс”) выкарыстоўваўся неахвотна і з адмоўнай характарыстыкай, а для пазначэння новых нерэалістычных плыняў найчасцей ужываўся тэрмін “нэарамантызм”. Тэарэтычным ідэолагам і аўтарам канцэпцыі неарамантызму ў беларускай прасторы стаў вядомы крытык, гісторык і публіцыст А. Луцкевіч. У шэрагу сваіх літаратурна-крытычных публікацый літаратуразнаўца адлюстроўваў і асэнсоўваў важнейшыя падзеі культурнага жыцця Беларусі, адзначаючы разнароднасць эстэтычных пазіцый нашаніўскіх паэтаў і пісьменнікаў (артыкул “Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі”, 1931). А. Луцкевіч заўважыў, што “«Н. Н.» (тут “Наша Ніва” – *І. В.*), злучаючы маладых аўтараў на грунце адраджэнскае ідэалёгіі, зусім не зацірала індывідуальных рысаў і ўласьцівасьцяў кожнага зь іх і ня вытварыла нейкага адзінага з фармальнага боку літаратурнага цячэньня. І ў сям'і «нашаніўцаў» дужа добра ўжываліся побач прадстаўнікі народніцкага натуралізму і рамантызму, рацыяналізму і містыцызму, пралетарскай барацьбы і эстэтызму, канчаючы разнароднымі плынямі нэарамантызму” [3, с. 256]. Пры гэтым беларускі крытык пад “разнароднымі плынямі нэарамантызму” падразумявае розныя мадэрністычныя тэндэнцыі: рамантызм (Я. Купала), містыцызм (А. Гарун, Я. Сваяк, М. Гарэцкі, З. Бядуля), эстэтызм (М. Багдановіч, Ф. Аляхновіч).

Асаблівую ўвагу ён надае эстэтызму як “кірунку”, “асноўныя тэзісы якога сфармуляваў М. Багдановіч” [3, с. 260]. Вытокі эстэтызму – у інтэлектуалізме, абумоўленым адукаванасцю, літаратурнай эрудыцыяй і прыродным пачуццём эстэтычнага густу творцы, што адлюстравалася ў вышуканай, “беззаганнай” форме твораў паэта. Эстэтызм М. Багдановіча выкрышталізоўваўся пад уплывам выдатных “вучыцелёў у асобах найлепшых прадстаўнікоў расейскае, украінскае, францускае і нямецкае літаратур” [3, с. 261] і асабліва знаёмства з творамі вядомага французскага імпрэсіяніста і сімваліста П. Верлена, які рэпрэзентаваў у сваёй паэзіі прыёмы музыкальнасці верша. У драматургіі Ф. Аляхновіча таксама заўважаны “элемэнты сымбалізму”, якія ўзнікаюць, на думку аўтара артыкула, пад уплывам польскага мадэрніста і тэарэтыка “Маладой Польшчы” С. Пшыбышэўскага. Хоць у цэлым літаратуразнаўца вызначае творчасць беларускага драматурга як рэалістычную.

Прадстаўнікі містыцызму ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. – пераважна “сыны вёскі”. А. Луцкевіч спрабуе патлумачыць схільнасць пісьменнікаў да містыфікацыі рэчаіснасці, вылучаючы “зчэрпненыя зь Біблii і Талмуду элемэнты жыдоўскае містыкі” [3, с. 260] у творах

З. Бядулі, выяўленне пошукаў “у містыцы адказу на недаўменныя пытанні, каторыя так востра паўстаюць перад выхаджэнцамі з народнае гушчы, адыйшоўшымі ад народнага сьветаўяўлення і не пасьпеўшымі пранікнуцца самай сучаснай цывілізацыяй” [3, с. 260], у творах М. Гарэцкага і інш. Аб'ядноўвае прыхільнікаў містыцызму зварот у творчасці да жывапіснага апяванне прыроды, народнай творчасці, фантазіі і міфалогіі, а галоўнае – адлюстраванне “сьветаадчуваньня хлебароба”, цесна звязанага з зямлёй і яе народнай стыхіяй.

Найбольш паслядоўны, “тыповы неарамантык” і “духовы павадыр адраджаючагася беларускага народу як суцэльнасці” [3, с. 260], на думку А. Луцкевіча, – паэт Янка Купала. Крытык адзначае, што на фарміраванне і ўдасканаленне паэтычнага майстэрства паэта вялікі ўплыў зрабілі польскія паэты-мадэрністы “Маладой Польшчы” (С. Пшыбышэўскі, Я. Каспровіч) і рускія паэты-сімвалісты (В. Брусаў, К. Бальмонт), а таксама рамантыкі (А. Міцкевіч, Ю. Славацкі). На прыкладзе паэзіі і драматургіі Я. Купалы літаратуразнаўца вылучае тыпалагічныя рысы неарамантызму як плыні: прызыў у творчасці “да змаганьня, да новага жыцьця, да высокіх агульналюдзкіх і нацыянальных ідэалаў”, “да вызваленьня ў беларусе – Чалавека”, багатая, разнародная і дасканалая лірыка, якая “захоплівае... сваёй магучай дынамікай, бурнымі парываньнямі, сілай экспрэсіі – пры незвычайным багацьці раўнастайнасьці формы ды гучнасьці й музыкальнасьці вершу” [3, с. 260]. У паэмах “Адвечная песня” і “Сон на кургане” А. Луцкевіч звяртае ўвагу на “элемэнты сымбалізму”, шэраг сімвалічных герояў, якія дапамаглі выявіць праблему нацыянальнага шляху беларускага народа. У творчасці Я. Купалы адбываецца канцэптуалізацыя неарамантычнага героя: яму ўласцівы духоўны дынамізм, унутраная актыўнасць, імкненне да свабоды, самарэалізацыі асабістай і грамадскай, што адрознівае яго ад героя рамантычнага, засяроджанага на індывідуальным супрацьстаянні свету.

Крытык адзначае нараджэнне ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. “новага беларуса”, які ўспрымаецца не толькі як эквівалент селяніна, вылучаецца не толькі нацыянальнай, сацыяльнай пазіцыяй, а вызначаецца іншымі крытэрыямі – новым светаадчуваннем, якое мае ўжо прыкметы “сучаснага нэрвовага, зь незвычайна зложанай псыхічнай арганізацыяй «цывілізаванага» эўрапейца” [3, с. 125]. Неарамантычная канцэптуалізацыя асобы непарыўна звязана з ідэяй вызвалення, якая спалучае “еўрапейскія” рысы бунтуючай, складанай асобы, што імкнецца да ўнутранай свабоды, і “перыферыйныя” рысы нацыянальна вызначанай асобы з выразнай грамадскай пазіцыяй, што імкнецца да ўзрастання пачуцця нацыянальнай і асабістай годнасці, незалежнасці. Злучанасць народніцкіх ідэалаў з мадэрніцкай эстэтыкай абумоўлена тым, што

развіццё беларускага мадэрнізму (неарамантызму) супала з моцнай хваляй нацыянальнага самаўсведамлення і з пачаткам распрацоўкі нацыянальнай ідэі ў беларускім грамадстве. Развіццё новай беларускай літаратуры А. Луцкевіч бачыў менавіта ў кантэксце спалучэння ідэі красы і свабоды: "…працай творчай і адчуваннем красы яны здолеюць знайсьці тую лінію разьвіцця, якая, не абніжаючы іх твораў з мастацкага боку, будзе найбольш, найпэўней адпавядаць новым настроям і новым імкненням «новага беларуса»" [3, с. 132].

Такім чынам, А. Луцкевіч вылучае адну з найважнейшых адметнасцей неарамантызму – пераемнасць, адсутнасць антытрадыцыйнай скіраванасці, характэрнай для іншых нерэалістычных плыняў пачатку XX ст. Указваючы на яго сувязь з польскім і рускім мадэрнізмам, а таксама на тое, што яго прадстаўнікі выхоўваліся на лепшых узорах еўрапейскай літаратурнай класікі, ён падкрэслівае нацыянальна-спецыфічны каларыт беларускага варыянта – фальклорны містыцызм у спалучэнні з еўрапейскім эстэтызмам, які абумоўлены адметным светаўспрыманнем: "Яны [Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч], праўда, чуюць па-своему, па-народнаму», але свае думкі і пачуцьці высказваюць агульнай для ўсіх «эўрапейцаў» мовай. Сваё, народнае яны прапускаюць праз нівелюючую прызму агульнаеўрапейскае цывілізацыі. І праз рамантызм, і рэалізм яны разам з усёй эўрапейскай паэзіяй даходзяць урэшце да тых новых кірункаў, якія маюць агульнае імя «нэарамантызму»: сымбалізму, мадэрнізму і г. д." [3, с. 126].

Неарамантызм у беларускай літаратуры паўстае ў некалькіх іпастасях: 1) як з'ява "пераходнага перыяду" – ад рэалізму (натуралізму) да мадэрнізму (творчасці прадстаўнікоў "Маладняка" і "Узвышша"); 2) як нерэалістычная літаратурная плынь пачатку XX ст. разам з сімвалізмам, дэкадансам, імпрэсіянізмам, мадэрнізмам; 3) як умоўная назва сукупнасці ўсіх новых нерэалістычных плыняў, тэндэнцый пачатку стагоддзя, якія фарміраваліся ва ўмовах апазіцыі пазітывісцкай філасофіі і абапіраліся на прынцыпы рамантычнай эстэтыкі і г. д. У такіх шырокіх інтэрпрэтатыўных магчымасцях тэрміна, на нашу думку, і заключаецца змест неарамантычнай канцэпцыі свабоды творчасці (як стыхійнай, сугестыўнай, ірацыянальнай энергіі), сінтэтызм новага мастацтва, а таксама адлюстроўваецца сутнасць гэтага надзвычай складанага і супярэчлівага перыяду ў развіцці беларускай літаратуры.

Неарамантызм, абраны для азначэння мадэрністычных тэндэнцый у беларускай літаратуры, робіць акцэнт менавіта на рамантычнай дамінанце ў новым напрамку, што прадвызначана культурна-гістарычнымі чыннікамі: станаўленне і развіццё літаратур знаходзілася ў цеснай узаемазалежнасці з працэсамі фарміравання нацый, нацыянальнай

самасвядомасці. "Рамантычная дамінанта, – як адзначае М. Тычына, – адпавядала светаадчуванню беларускіх адраджэнцаў, у аснове якога ляжаў разлад паміж нацыянальнымі ідэаламі і сацыяльнай рэчаіснасцю, неспрыяльнай для духоўнага самавыяўлення і нацыянальна змястоўнага існавання" [4, с. 81].

Цікавасць прадстаўнікоў рамантызму да нацыянальнага духу, праблем народнасці, фальклору, міфалогіі і этнаграфіі, а таксама рамантычнай ідэі свабоды асобы мастака і мастацтва асабліва імпанавала літаратарам нацый, якія адраджаліся.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Багдановіч, І. Ля вытокаў беларускага дэкадансу / І. Багдановіч // Полымя. – 2001. – № 12. – С. 257–271.

2. Літературознавчий словник-довідник / Р. Т. Гром'як [та ін.]. – Київ : Академія, 1997. – 752 с.

3. Луцкевіч, А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевіч. – Мінск, 2006. – 460 с.

4. Тычына, М. А. Феномен пераходнага перыяду: праблема тыпалогіі / М. А. Тычына // Літаратура пераходнага перыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу. – Мінск, 2007. – С. 3–101.

5. Янкоўскі, Е. Песняры маладой Беларусі / Е. Янкоўскі // Беларуская літаратура XIX – пачатку XX ст. : хрэстаматыя крытычных матэрыялаў / С. Х. Алесандровіч, Н. С. Александровіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1978. – С. 125–133.

**Е. А. ИГНАТЮК**
Пинск, Полесский государственный университет

## «ЗАБЛУЖДАЮЩИЙСЯ ЧЕЛОВЕК» ФРЭНСИСА БЭКОНА И ЕГО ОТРАЖЕНИЕ В ФИЛОСОФИИ И ЛИТЕРАТУРЕ ЭКЗИСТЕНЦИАЛИЗМА

Многие люди думают, что они почти все знают о себе и других, потому что много читают, верят в «авторитеты», очарованные философскими теориями многих мыслителей. Так ли это?

Мы проинтерпретировали символического *Человека*, плененного *идолами театра*, взятого им из трактата «Новый органон» (1620) Фрэнсиса Бэкона (1561–1626) – английского философа, историка, политика, основоположника эмпиризма и английского материализма. В своей работе Фрэнсис Бэкон указал на *помехи*, которые мешают истинному познанию; их он назвал «идолами». Особенно интересно рассматривать «идолов театра» – как форму ошибочного (невежественного) мышления. Думается, имеет резон связать *бэконовского* человека с «отчаявшимся